**С. Я. Новікаў**

***80-й гадавіне Вялікай Перамогі прысвячаецца***

# ДАКУМЕНТЫ ФОНДУ WI IN MITTE АБ НАЦЫСЦКІМ ЭКАНАМІЧНЫМ ГЕНАЦЫДЗЕ НА АКУПАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1941–1944)

У пераліку злачынстваў германскіх нацыстаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі асаблівае месца побач з прамымі формамі знішчэння грамадзянскага насельніцтва займае прымусовая праца. Паколькі наўмыснае стварэнне для якой-небудзь групы такіх жыццёвых умоў, якія вядуць да яе поўнага ці частковага фізічнага знішчэння, у тым ліку шляхам рабскай працы, эксплуатацыі і галоднай смерці, намі разглядаецца як акт нацысцкага эканамічнага генацыду [1, с. 69]. Яго праявы былі характэрнымі для тэрыторыі Беларусі з моманту яе захопу германскім вермахтам, усталявання ваеннай улады

і пачатку дзейнасці розных нямецкіх ваенна-эканамічных службаў. Пра гэта сведчаць шматлікія нямецкія трафейныя дакументы, даступныя для беларускіх гісторыкаў.

Аналіз нямецкіх дакументаў, якія на цяперашні час складаюць фонд гаспадарчай інспекцыі “Цэнтр” (ф. 412 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь), пераконвае даследчыкаў у тым, што з пачаткам аперацыі “Барбароса” грамадзянскае насельніцтва БССР адразу разглядалася нямецкімі захопнікамі як аб’ект нацысцкай эканамічнай палітыкі і гаспадарчай дзейнасці вайсковых аддзелаў, гаспадарчых каманд і іх філіялаў, а таксама нарыхтоўчых службаў, спецыяльных аддзелаў галоўнага кватэрмайстра, ахоўных дывізій і палкавых камендатур, якія забяспечваліся харчаваннем з нарыхтоўчай акругі “Днепр” (створана ў другой палове лета на тэрыторыі вобласці тылу групы армій “Цэнтр” з раёнамі Мінска, Бабруйска, Гомеля). Як вынік вобласць тылу групы армій “Цэнтр” размяшчалася па ўмоўнай лініі на ўсход ад Барысава: у яе склад уваходзіла фактычна палова беларускай тэрыторыі з насельніцтвам амаль у 3,5 млн чалавек [2, Bl. 108], якія з канца лета 1941 г. знаходзіліся ў сферы дзейнасці гаспадарчай інспекцыі “Цэнтр”.

Аб маштабах прыцягнення мясцовага насельніцтва да рабскай працы ва ўсходняй частцы Беларусі пераканаўча сведчаць статыстычныя матэрыялы з трафейнага фонду Wi In Mitte. Так, дакументы групы “статыстыка” (галаўная група “Эканоміка”) гаспадарчай інспекцыі “Цэнтр”, якая з ліпеня 1941 г. і па канец кастрычніка 1943 г. дзейнічала на беларускай і расійскай тэрыторыі ў якасці галоўнага ваенна-эканамічнага органа, утрымліваюць надзвычай важныя звесткі, у тым ліку аб агульнай колькасці грамадзянскага насельніцтва, а таксама аб колькасці мясцовых працаўнікоў, занятых у розных галінах вытворчасці і сельскай гаспадаркі. З дакумента вынікае, што агульная колькасць насельніцтва на тэрыторыі гаспадарчай інспекцыі “Цэнтр”, у тым ліку расійскай, на канец сакавіка 1943 г. складала прыкладна 5,8 млн чалавек, з якіх 1 392 000 (24 %) былі мужчыны, 2 262 000 (39 %) – жанчыны і 2 146 000 (37 %) з’яўляліся дзецьмі. У той жа час ва ўсходніх беларускіх раёнах пражывала больш за 3,5 млн чалавек, ці амаль 61 % ад агульнай колькасці [2, Bl. 108].

Агульную карціну працоўнага выкарыстання мясцовага насельніцтва і прыцягнення яго да розных работ у прамысловасці і сельскай гаспадарцы раскрываюць асноўныя сферы яго занятасці, што адлюстравана ў статыстычных даных аб дзейнасці галаўной групы “Эканоміка”, прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі, работнікаў лясной гаспадаркі і дрэваапрацоўкі, рамеснікаў, мясцовых работнікаў арганізацыі Тодта, рэгіянальных чыгунак і стратэгічна важных дарог, а таксама аб прыцягненні мясцовага насельніцтва да работы па абслугоўванні імперскай чыгункі, у мясцовай службе парадку, у органах лакальнага кіраўніцтва, пры нямецкіх вайсковых часцях і г.д. У дакуменце пры гэтым адзначаецца, што на момант правядзення ўліку

агульнай колькасці мясцовых працаўнікоў у сферы прамысловасці не прыведзены звесткі аб сезонных прадпрыемствах (торфараспрацоўкі, цагельні), якія толькі распачыналі работу [2, Bl. 108].

У галіновым плане за 1941/42 гаспадарчы год утрымліваюцца наступныя статыстычныя звесткі, адпаведна: 63 тыс. рабочых былі заняты ў розных галінах прамысловасці; у галаўной групе "лясная гаспадарка і дрэваапрацоўка" працавалі 18 000 чалавек; на прадпрыемствах па перапрацоўцы прадукцыі сельскай гаспадаркі – 19 000 чалавек; звыш за 60 тыс. мясцовых рабочых былі заняты ў службах па абслугоўванні імперскай дырэкцыі чыгунак і мясцовых чыгунак, каля 3000 чалавек працавалі на стратэгічных шашэйных дарогах; у будаўнічай арганізацыі Тодта працавалі 40 000 мясцовых рабочых. Апрача таго, стаяла задача па замене 11 500 ваеннапалонных, занятых у якасці працоўнай сілы. На тэрыторыі інспекцыі "Цэнтр" працавала каля 50 000 рамеснікаў; у структуры дапаможнага мясцовага кіравання былі заняты 60 000 чалавек, столькі ж – у мясцовай службе парадку; да 130 000 цывільных мясцовых грамадзян былі задзейнічаны вермахтам у якасці рабочай сілы. Апроч таго, 10 тыс. чалавек былі заняты на іншых работах. Паводле звестак галаўной групы "сельская гаспадарка", па стане на 1.07.1942 г. на тэрыторыі эканамічнай інспекцыі "Цэнтр" у сельскагаспадарчай сферы былі заняты амаль 2,5 млн мясцовых жыхароў, з якіх 38 % – мужчыны і 62 % – жанчыны [3, Bl. 72].

Паводле нямецкіх статыстычных матэрыялаў, у канцы другога 1942/43 гаспадарчага года агульная колькасць занятых у розных галінах вытворчасці на тэрыторыі эканамічнай інспекцыі "Цэнтр" дасягала амаль 750 тыс. чалавек, у тым ліку 314 812 тысяч дзяцей (42 %) ва ўзросце да 14 гадоў. Пры гэтым звыш за 245 тыс. (32 %) занятых у гэтых сферах вытворчасці выконвалі работы нармальнай цяжкасці, 13,5 % (101 477) – цяжкія работы. На асабліва цяжкіх работах былі заняты каля 3,3 % ад усіх працуючых. Больш за 60 тыс. (8 %) мясцовых рабочых знаходзіліся на казарменным становішчы [4, Bl. 128].

Маштабы, геаграфія і метады выкарыстання рабочай сілы становяцца даволі відавочнымі ў канцы першага 1941/42 гаспадарчага года. Паміж аддзеламі, вярбовачнымі камісіямі, гаспадарчымі камандамі, камендатурамі і іншымі германскімі ваенна-эканамічнымі службамі пачалася сапраўдная канкурэнцыя за рабочую сілу, патрэба ў якой усё больш востра адчувалася не толькі ў ваеннай эканоміцы на тэрыторыі рэйха, але на акупаванай усходняй тэрыторыі, у тым ліку на тэрыторыі тылу групы армій "Цэнтр". Пры тым што пастаўка рабочай сілы ў рэйх з'яўлялася больш прыярытэтнай задачай у параўнанні з яе выкарыстаннем на захопленай тэрыторыі, аднак фактычныя маштабы прыцягнення рабочай сілы на месцы сведчаць аб наяўнасці іншай даволі відавочнай тэндэнцыі. Калі на працягу 1941/42 гаспадарчага года на месцах назіраўся лішак працаздольнай рабочай сілы, дык у 1942/43 гаспадарчым годзе ўзрастае яе востры недахоп, асабліва кваліфікаваных спецыялістаў. Галоўнымі прычынамі такога становішча з'яўляліся: па-першае, арганізаваны ў рамках праграм генеральнага ўпаўнаважанага па выкарыстанні рабочай сілы мэтавы вываз мясцовага насельніцтва і ваеннапалонных на работы ў рэйх;

па-другое, гібель ваеннапалонных, ліквідацыя яўрэяў і скарачэнне мясцовага насельніцтва; па-трэцяе, больш шырокае прыцягненне мясцовай рабочай сілы да работ па аднаўленні прамысловай вытворчасці на акупаванай тэрыторыі; і нарэшце, прыцягненне насельніцтва прыфрантавой зоны да ўзвядзення лініі палявых умацаванняў [5].

Паводле статыстычных даных, у канцы першага гаспадарчага года на тэрыторыі эканамічнай інспекцыі "Цэнтр" агульная колькасць рабочай сілы, якая выкарыстоўвалася ў сельскай гаспадарцы, складала 2 654 тыс. чалавек, з якіх 1 844 тыс., ці 69,5 %, складалі жанчыны і моладзь [6, Bl. 17]. Больш за палову ад гэтай колькасці рабочай сілы знаходзілася на тэрыторыі Беларусі. Доля занятых у кантэксце агульнай колькасці насельніцтва на тэрыторыі ўсходняй Беларусі (вобласць тылу групы армій "Цэнтр") складала 41 %, тады як у генеральнай акрузе Беларусь – 45,6 % [7, Bl. 304].

Вывучэнне статыстычных матэрыялаў вядучых гаспадарчых каманд (ГК) "Віцебск", "Орша" і "Бабруйск" паказвае, што вясной 1942 г. агульная колькасць насельніцтва складала 3 528 339 чалавек, ці 60,8 % ад усіх жыхароў, узятых на ўлік на беларускай тэрыторыі эканамічнай інспекцыі. Пры гэтым доля насельніцтва на тэрыторыі ГК "Віцебск" складала толькі 772 151 (13,3 %), на тэрыторыі ГК "Орша" – 1 308 195 (22,5 %), тады як на тэрыторыі ГК "Бабруйск" гэта лічба раўнялася 1 447 993 (31,2 % ад агульнай колькасці мясцовага насельніцтва). Аналізуючы колькасныя паказчыкі, важна адзначыць, што ўлік насельніцтва праводзіўся біржамі працы, якія дзейнічалі ў рамках вядучых ГК "Віцебск", "Орша" і "Бабруйск" [8, Bl. 2].

У сярэдзіне 1942/43 гаспадарчага года назіраюцца новыя тэндэнцыі ў колькасных зменах сярод мясцовага насельніцтва. Калі спачатку акупацыйныя органы ўлады цікавілі ў першую чаргу статыстычныя звесткі аб агульнай колькасці насельніцтва, дык у канцы 1942 г. у парадак дня становіцца ўлік жыхароў, пачынаючы з 14-гадовага ўзросту. Дзеці ніжэй гэтага ўзросту дадаткова выдзяляліся ў групу 12–14 гадоў. Эканамічныя службы былі вельмі заклапочаны стварэннем агульнай колькаснай базы, якая б давала поўную карціну для перспектыўнага планавання маштабаў выкарыстання мясцовай рабочай сілы. Як бачна з дакументаў, па стане на лістапад 1942 г., то бок крыху больш чым праз паўгода, на тэрыторыі ўсходняй Беларусі агульная колькасць насельніцтва ў параўнанні з сакавіком гэтага ж года зменшылася толькі на 99 262 чалавекі і складала 3 429 077, з якіх дзеці да 14 гадоў складалі 1 246 652 чалавекі, ці 36,3 %. Пры гэтым колькасць мужчын складала 857 374 чалавекі, ці роўна чвэрць адгульнай колькасці грамадзянскага насельніцтва [9, Bl. 164].

Агляд статыстычных матэрыялаў сведчыць, што ў пераліку даных гаспадарчых каманд эканамічнай інспекцыі "Цэнтр" і нямецкіх камендатур побач з агульнай колькасцю ўтрымліваюцца звесткі пра падзел насельніцтва на гарадское і сельскае, мужчын і жанчын, а таксама дзяцей. Гэта было важным для высвятлення агульнай колькасці працаздольнага насельніцтва, наяўнасці

беспрацоўных і непасрэдна занятых на вытворчасці, асабліва з улікам іх прафесійнай дзейнасці. Як адзначаецца ў нямецкіх дакументах, мужчыны ва ўзросце ад 20 да 40 гадоў, а таксама спецыялісты практычна адсутнічалі.

На працягу паўгода агульная колькасць насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў разрэзе біржаў працы змяншалася. Асабліва адметным такое змяншэнне адбылося па звестках біржы працы Барысава, Оршы, Магілёва. Прапорцыя суадносін паміж мужчынамі і жанчынамі захоўвалася на карысць апошніх, у асноўным як 2 да 3.

Паводле статыстычных даных, большасць занятых на тэрыторыі гаспадарчых каманд "Віцебск", "Орша" і "Бабруйск" працавала ў сельскай гаспадарцы. Як бачна са звестак галаўной групы "праца" эканамічнага штаба Ост, датычных усёй акупаванай савецкай тэрыторыі, суадносіны працуючых у сельскай гаспадарцы і занятых у прамысловасці складам як 20 да 1. Тады як на тэрыторыі эканамічнай інспекцыі "Цэнтр" гэтыя катэгорыі занятых суадносіліся як 5 да 1. Неабходна асобна зазначыць, што ў статыстычныя даныя эканамічнага штаба "Ост" не былі ўключаны дзясяткі тысяч мясцовых грамадзян, якія на месцах прыцягваліся да прымусовай працы ў якасці рабочай сілы пасля ліквідацыі гэтага ваенна-эканамічнага органа восенню 1943 г. Да гэтага трэба дадаць, што да канца 1942 г. з тэрыторыі Беларусі, якая ўваходзіла ў склад эканамічнай інспекцыі "Цэнтр", на работы ў рэйх былі вывезены першыя 100 тысяч чалавек. З аналізу статыстычных даных бачна, што дэпартацыя мясцовага насельніцтва на прымусовыя работы ў Германію складала зусім нязначную частку ад тых, хто прыцягваўся нямецкай ваеннай адміністрацыяй да розных работ на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Наглядна карціну выкарыстання мясцовай рабочай сілы можна паказаць на прыкладзе галаўной групы "эканоміка" і яе некалькіх вытворчых галін, дзеючых на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Геаграфія галін прамысловай вытворчасці, адноўленых да канца першага 1941/42 гаспадарчага года на тэрыторыі эканамічнай інспекцыі "Цэнтр" (уключна заходнія раёны Расіі), дае магчымасць для выяўлення пэўных структурных і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адметнасцей: колькасць і канцэнтрацыя прамысловых прадпрыемстваў узрастала з усходу на захад і ўшчыльненне – з поўначы на поўдзень. Так, калі на тэрыторыі вядучай ГК "Віцебск" знаходзілася толькі 1/6 частка прамысловых прадпрыемстваў з колькасцю занятых на іх у 5100 чалавек (ці 11,4 %), дык на 159 прадпрыемствах (30 %) вядучай ГК "Орша" працавалі 16 200 рабочых (36,6 %). Але найбольшая колькасць прамысловых прадпрыемстваў знаходзілася на тэрыторыі вядучай ГК "Бабруйск" – 173 (32,2 %), дзе працавалі 18 000 чалавек (42,3 %).

Спроба выяўлення асноўных галіновых прыкмет занятасці мясцовага насельніцтва ў прамысловасці на тэрыторыі вядучых гаспадарчых каманд "Віцебск", "Орша" і "Бабруйск" прыводзіць да наступных вынікаў. Так, вясной 1942 г. асноўная маса занятых знаходзілася ў торфаздабычы (20 375 чалавек), лясной гаспадарцы і лесанарыхтоўцы (15 000 чалавек), ці 52 %. Другую (меншую) частку занятых у прамысловасці складалі рабочыя іншых галін, сярод

якіх дрэваапрацоўка з 8478 занятымі (13 %), тэкстыльная і папяровая індустрыя з 6717 занятымі (10 %). Гэтыя тры галіновыя групы ахоплівалі ¾ ад усіх рабочых, якія працавалі на 331 прадпрыемстве. На 168 прадпрыемствах металаапрацоўкі і вытворчасці электраэнергіі працавала 12 % ад усіх занятых рабочых. Менш за ўсё было занятых (ад 1 769 да 2 424 рабочых) у хімічнай прамысловасці, вытворчасці шкла і будматэрыялаў. На 41 прадпрыемстве гарбарнай вытворчасці працавалі 1439 мясцовых рабочых.

У рэгіянальным плане на тэрыторыі эканамічнай інспекцыі "Цэнтр" асноўная частка прадпрыемстваў прыпадала на ГК "Бабруйск". Толькі папяровая, ганчарная, вытворчасць будаўнічых матэрыялаў і нарыхтоўка ўтылю займалі больш значнае месца на тэрыторыі іншых гаспадарчых каманд. Гаспадарчая каманда "Бабруйск" з 13 800 рабочымі, занятымі на 138 прадпрыемствах, займала 3/10 ад агульнай колькасці ўсіх прадпрыемстваў і 55% – ад усіх працуючых. Першае месца па колькасці працуючых займала тэкстыльная прамысловасць з 4681 чалавекам, занятым у Клінцах. Увогуле на гэту галіну на тэрыторыі гаспадарчай каманды "Бабруйск" прыпадала каля 7/10 рабочых. Паводле статыстычных звестак аб колькасці занятых на вытворчасці другое месца займала дрэваапрацоўка з 3744 рабочымі. Гэта складала практычна палову ад усіх рабочых, занятых на прадпрыемствах дрэваапрацоўкі на тэрыторыі гаспадарчай каманды. Крыху звыш за 1/8 (ці 1824 чал.) ад агульнай колькасці рабочых працавалі ў металаапрацоўцы. Хаця паводле колькасці занятых хімічная і гарбарная вытворчасці займалі ад 6 да 9 % ад агульнай колькасці працуючых, але яны мелі даволі важнае значэнне на ўсёй тэрыторыі эканамічнай інспекцыі "Цэнтр", паколькі сведчаць аб занятасці ў першым выпадку 7/10, а ў другім – 6/10 ад усіх занятых на тэрыторыі ГК "Бабруйск".

На долю ГК "Орша" прыпадала толькі чвэрць ад усіх занятых (5581 чалавек). Галоўную ролю тут адыгрывала дрэваапрацоўка з каля 2700 рабочымі. Затым ішла металаапрацоўка з амаль 1000 рабочых. Блізкімі адна да адной па паказчыках сталі тэкстыльная і хімічная вытворчасці, дзе былі заняты адпаведна 512 і 499 рабочых. У астатніх галінах у ГК "Орша" працавала толькі 1/6 ад усіх занятых на вытворчасці.

У ГК "Віцебск" была задзейнічана толькі 1/10 частка ад усіх рабочых (2240). Дрэваапрацоўка займала тут лідзіруючыя пазіцыі з 626 (28 %) рабочымі, за ёй ішла тэкстыльная індустрыя з 584 рабочымі (26 %). Даволі значную долю займала вытворчасць будматэрыялаў – звыш за 400 рабочых (18 % ад усіх задзейнічаных рабочых на тэрыторыі ГК "Віцебск").

Разгляд эканамічнай сітуацыі скрозь прызму агульнай занятасці мясцовага насельніцтва на тэрыторыі іншых гаспадарчых каманд, якія дзейнічалі на тэрыторыі эканамічнай інспекцыі "Цэнтр", набліжае да выяўлення і такіх адметнасцей. Зусім невялікае значэнне мелі ГК "Швайдніц" і ГК, якія дзейнічалі на акупаванай расійскай тэрыторыі, што знаходзілася ў вобласці аператыўнага тылу камандавання 2-й танкавай арміі, дзе былі заняты каля 12 % ад усіх рабочых, адпаведна 1 540 і 1 440 чалавек. Гаспадарчыя каманды, якія дзейнічалі ў вобласці 3-й танкавай арміі, выконвалі зусім нязначную ролю, паколькі тут

былі заняты толькі 366 рабочых, ці 1,5 % ад колькасці ўсіх занятых. Такое становішча тлумачыцца тым, што на гэтай тэрыторыі індустрыя была практычна цалкам разбурана. Аналізуючы прычыны, якія прывялі да такога становішча, нямецкія гаспадарчыя службы адзначалі, што калі ў Клінцах (Бранская вобласць) прамысловыя прадпрыемствы патрапілі да немцаў без асабліва значных разбурэнняў, дык прамысловасць Гомеля была немцамі безнадзейна разбурана ў ходзе захопу горада. Параўноўваючы расійскі горад Смаленск і беларускі горад Гомель, дзе перад вайной пражывала амаль аднолькавая колькасць жыхароў (адпаведна 156 000 і 150 000 чалавек), бачна, што ў расійскім горадзе засталося толькі 29 тыс. чалавек, тады як у беларускім – амаль удвая больш (50 000). Да другой важнай прычыны адносіцца недахоп тэхнічнага абсталявання, а таксама недастатковае і нерэгулярнае забеспячэнне электраэнергіяй. Але нягледзячы на гэтыя і іншыя перашкоды ваеннага часу ваеннай адміністрацыі ўдалося аднавіць некаторую частку прамысловай вытворчасці [10, Bl. 43–46].

Тэндэнцыя зменаў у прамысловых сектарах акупаванай эканомікі паказвае, што калі ў канцы першага гаспадарчага 1941/42 года налічвалася 543 прамысловыя прадпрыемствы з агульнай колькасцю 42 374 чалавекі (вядучымі галінамі з'яўляліся торфаздабыча і тэкстыльная), дык у сярэдзіне другога гаспадарчага 1942/43 года агульная колькасць прадпрыемстваў вырасла да 721, а колькасць рабочай сілы ўзрасла да 95 805 чалавек, пры гэтым 74,3 %, ці 70 407 чалавек, працавалі на прадпрыемствах ГК "Бабруйск", "Барысаў", "Гомель", "Магілёў", "Клімавічы", "Орша", "Віцебск", "Лепель" і "Полацк". Самая вялікая колькасць занятых на гэтай тэрыторыі працавала ў лясной гаспадарцы і дрэваапрацоўцы – 45 950 (47,9 %) [11, Bl. 198].

У апошні 1943/44 гаспадарчы год на тэрыторыі ўсходняй Беларусі складваецца амаль катастрафічнае становішча ў сферы выкарыстання мясцовай працоўнай сілы. Па ацэнцы нямецкага гісторыка Х. Герлаха, хаця доля працуючых у адносінах да агульнай колькасці насельніцтва Беларусі была "не самай высокай", між тым яна складала: у Барысаве – 33 %, у Суражы і Гарадку – 38 і 47,5 % адпаведна, у вобласці тылу групы армій "Цэнтр" – 41 % [12, S. 456]. Але ва ўмовах татальнага выкарыстання мясцовай працоўнай сілы нямецкія акупацыйныя ўлады шукалі розныя шляхі прыцягнення і нават заахвочвання мясцовай рабочай сілы. Так, напрыклад, у пачатку трэцяга 1943/44 гаспадарчага года ваеннае ўпраўленне пры камандаванні групы армій "Цэнтр" узнагародзіла нават бронзавымі крыжамі 2-й ступені (без мячоў) 7 мясцовых рабочых – аднаго галоўнага агранома, 2 вартаўнікоў, аднаго кіраўніка прадпрыемства, аднаго кантралёра і аднаго ляснічага, якія працавалі на тэрыторыі гаспадарчай каманды "Віцебск" і яе філіяла ў "Полацку" [13, Bl. 6].

Татальны маштаб прыцягненне мясцовай рабочай сілы на тэрыторыі ўсходняй Беларусі набыло ў сувязі з узвядзеннем вермахтам г.зв. "усходняга вала". Так, у Гомелі ў красавіку 1942 г. для выканання гаспадарчых работ быў прыцягнуты кожны пяты жыхар акупаванага горада (з 54 тысяч), а праз паўгода – кожны трэці. Вясной 1943 г. у раёне Оршы і Віцебска для правя-

дзення работ патрабавалася 50 тыс. чалавек [14, S. 309]. Недахоп працоўнай сілы сярод мірнага насельніцтва ў гэтым выпадку пакрываўся за кошт прыцягнення да рабскай працы ваеннапалонных [15, Bl. 31–31 R].

Катастрафічным становішча гарадскога і сельскага насельніцтва ва ўсходняй частцы Беларусі становіцца на рубяжы 1943/44 гг., калі армейскае камандаванне патрабавала татальнага "выкарыстання працоўнай сілы без уліку ўзросту і палавых адрозненняў" для правядзення работ у прыфрантавой паласе. Так, для стварэння палявых умацаванняў на лініі абароны 3-й танкавай арміі, месцам знаходжання якой з'яўляўся раён Віцебска, прыцягваліся ўсе без выключэння мужчыны і жанчыны, у тым ліку: у сталым узросце, цяжарныя жанчыны (на 9-м месяцы цяжарнасці) і хворыя і інш. [16, S. 320]. Колькасць мясцовага насельніцтва, занятага на ўзвядзенні лініі нямецкіх умацаванняў, у канцы 1943 г. узрасла амаль удвая і складала звыш за 20 тыс. чалавек. Камандаванне арміі выдаткавала 37 тыс. RM з мэтай заахвочвання мясцовых жыхароў, якія працавалі ў нямецкіх службах, на прадпрыемствах і ў структурах кіравання, выдавала ім у першую чаргу тканіну, вопратку, абутак, а перад Калядамі кожны рабочы атрымаў па 3 пакеты махоркі, а жанчыны – па 2 упрыгожанні [17, Bl. 2 – 3].

На заключным этапе германскай акупацыі прыцягненне мірнага насельніцтва да выканання работ па будаўніцтве абарончых умацаванняў на "лініі пантэр" (апошняя цягнулася з поўначы на поўдзень Беларусі па рэках Проня і Сож. – *С.Н.*) з'яўлялася адной з важных задач нямецкіх дывізій, якія адступалі па тэрыторыі Беларусі. З гэтай мэтай камандаванне карпусоў і дывізій патрабавала актыўнага выкарыстання мясцовых жыхароў у якасці працоўнай сілы для выканання загаду Гітлера аб стварэнні непрыступнага "ўсходняга вала". Жыхароў прымусова збіралі ў рабочыя каманды і калоны і накіроўвалі на ўчасткі, дзе яны ў аддаленасці ад сваіх вёсак знаходзіліся ў працоўных лагерах [16, S. 203]. Па прычыне недахопу працоўная сілы, а таксама ў сувязі з несвоечасовасцю падрыхтоўкі палявых умацаванняў камандуючы групы армій "Цэнтр" генерал-фельдмаршал Буш 10 мая 1944 г. выдаў загад аб прыцягненні да прымусовых работ дзяцей ва ўзросце вышэй за 10 гадоў [16, S. 204].

Такім чынам, аналіз нямецкіх дакументальных крыніц з трафейнага фонду Wi In Mitte дае надзейную падставу для ўсебаковага навуковага асвятлення адной з малавядомых старонак ваеннай гісторыі Беларусі. На прыкладзе больш дэталёвага вывучэння статыстычных даных аб рабочай сіле на акупаванай тэрыторыі групы армій "Цэнтр" нам удалося выявіць даволі важную з'яву эканамічнага кшталту, звязаную з агульнай колькасцю тых, хто знаходзіўся на акупаванай тэрыторыі і быў пераўтвораны ў суб'ект нацысцкай эканамічнай палітыкі, у тым ліку ў ахвяру нацысцкага эканамічнага генацыду. Гэта датычылася вялікай часткі грамадзянскага насельніцтва, якое выкарыстоўваля ў якасці рабочай сілы ў розных сферах прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці. Але поўную карціну занятасці насельніцтва на ўсёй акупаванай

тэрыторыі Беларусі можна будзе даследаваць на аснове дакументальных крыніц, якія раскрываюць гэту праблему ў дачыненні да іншых частак беларускай тэрыторыі, якая знаходзілася ў падпарадкаванні цывільнай адміністрацыі ў генеральных акругах “Беларусь”, “Валынь–Падолія”, “Жытомір”, “Літва” і акрузе “Беласток”. Толькі на аснове новых дакументальных фактаў можна будзе спадзявацца на комплекснае вывучэнне гэтай тэмы і яе аб’ектыўнае даследаванне ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Новікаў, С.* Аб маштабах нацысцкага эканамічнага генацыду беларускага сялянства ў 1941–1944 гадах / С. Новікаў // Беларуская думка. – 2023. – № 11. – С. 68–75.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 412. Воп. 1. – Спр. 87: Aufstellung der zivilen Arbeitskräfte im Inspektionsbereich Mitte: Versorgung der zivilen Arbeitskräfte, vom 7. Februar 1943, Bl. 108.
3. НАРБ – Ф. 412. Воп. 1. Спр. 87 : Textilversorgung der einheimischen Arbeitskräfte für die Zeit vom 1.10.43 – 31.3.1944: Schreiben Nr. 94993 an die Wi In Mitte Chefgruppe W, Gruppe Textil, vom 5.4.1943, Bl. 71–72.
4. Федэральны ваенны архіў Германіі (далей – BA-MA). – RW 31/570: Versorgungsplanung berechnet unter Zugrundelegung der im Bereich der H. Gr. Mitte festgesetzten Rationen für die Zeit vom 1.7. bis 15.9.1943. Anlage 3, Bl. 128.
5. Verordnung über Arbeitspflicht und Arbeitseinsatz im Operationsgebiet der neu besetzten Ostgebiete // Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten 1941–1943 / hrsg. und eingeleitet von Rolf-Dieter Müller. – Boppard am Rhein : Harald Boldt Verlag, 1991. – S. 303.
6. BA-MA. – RW 31/306 : Wi Stab Ost, Chefgr, La 2 a 3 und RMfbO, III E 2 a : Die Landwirtschaft in den besetzten Ostgebieten. Statistik der landwirtschaftlichen Erzeugung 1942, Bl. 17.
7. BA-MA. – RW 31/306 : Wi Stab Ost, Chefgr, La 2 a 3 und RMfbO, III E 2 a : Die Landwirtschaft in den besetzten Ostgebieten. Statistik der landwirtschaftlichen Erzeugung 1942, Bl 17; – RW 31/562 : Wi In Mitte, Chefgruppe Arbeit : Grundlagen für Arbeitseinsatzplanung v. 31.12.42, Bl. 304.
8. BA-MA. – RW 31/558 : Lagebericht für Monat März 1942, v. 31.3.1942. Anlage 1 zur Lagebericht Nr. 15, Bl. 2.
9. BA-MA. – RW 31/570: Statistischer Bericht Nr. 1 des Arbeitsausschusses v. 30. Juli 1943, Bl. 164.
10. BA-MA. – RW 31/570: Statistischer Bericht Nr. 1 des Arbeitsausschusses v. 30. Juli 1943, Bl. 43–46.
11. НА РБ – Ф. 412. Воп. 1. Спр. 118 : Zusammenfassende Übersicht über Anzahl der arbeitenden Betriebe und der Beschäftigten nach dem Stande vom 20.1.1943, Bl. 198.

12. *Gerlach, Ch.* Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg : Hamburger Edition, 1999. – S. 456.
13. BA-MA. – RW 31/799: Herresgruppenwirtschaftsführer beim Obkdo. d. Heeresgruppe Mitte: Verdienst- auszeichnungen für Angehörige der Ostvölker 2. Kl. (ohne Schwerten) in Bronze, v. 21.12.1943, Bl. 6.
14. *Pohl, D.* Die Herrschaft der Wehrmacht. Die Deutsche Militärbesatzung und die einheimischen Bevölkerung der Sowjetunion 1941–1944 / D. Pohl. – München : Oldenbourg Wissenschaftsverlag, 2008. – 399 S.
15. НАРБ. – Ф. 378. Оп. 1. Д. 539 : RVD Minsk : EAW Gomel : Sofortbedarf an Arbeitskräften in EAW Gomel v. 6.7.1943, Bl. 31–31 R.
16. *Müller, N.* Wehrmacht und Okkupation. Zur Rolle der Wehrmacht und ihrer Führungsorgane im Okkupationsregime des faschistischen deutschen Imperialismus auf sowjetischem Territorium / N. Müller. – Berlin : Militärverlag, 1971. – 432 S.
17. BA-MA. – RW 31/799 : Rückblick über die Zeit vom 1. Oktober 1943 bis 9. Januar 1944 (mit Rücksicht auf die Auflösung des Wi Kdos 206 mit der Wirkung von 10.1.1944 schlisst mit diesem Zeitpunkt ab, Bl. 2–3.